*Асабісты выбар*

# КАМАНДЗІР ВЯДЗЕ ЗА САБОЙ

Для многіх прадстаўнікоў моладзі ўступленне ў студэнцкі атрад падчас навучання становіцца яркай прыступкай у дарослае жыццё. Хтосьці знаходзіць сяброў і зарабляе першыя грошы, а хтосьці дасягае большага. Сёлета пяцікурснік Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Е. Полацкай Вадзім Ложачнік быў удастоены ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны — 2023».



Да паступлення ў ПДУ малады чалавек скончыў сталічны будаўнічы ліцэй № 12 і Мсціслаўскі дзяржаўны будаўнічы каледж. Цяпер Вадзім асвойвае спецыяльнасць «Аўтамабільныя дарогі» і адначасова сферу прамысловага і грамадзянскага будаўніцтва. Нягледзячы на тое што львіную долю свайго часу і сіл хлопец прысвячае вучобе, доўгія гады асаблівую палічку ў яго сэрцы займала студатрадаўская дзейнасць — ён працяглы час быў камандзірам атрада «Эўрыка», які не першы год у краіне прызнаецца найлепшым.

Герой лічыць, што кожны студэнт можа выбраць сам, як правесці гады ва ўніверсітэце: напоўніць іх яркімі фарбамі або пераўтварыць у руціну. Вадзім абраў першы варыянт і не пралічыўся, бо прыкласці руку да будаўніцтва Беларускай АЭС і пабываць на касмадроме ўдаецца далёка не ўсім. У складзе «Эўрыкі» сёння 20 студэнтаў з розных факультэтаў, кожны з іх валодае талентамі, якія дапамагаюць атраду пацвярджаць званне найлепшага ў краіне. І калі дзесяць гадоў таму ў будаўнічы атрад прымалі ўсіх ахвотных, то сёння ў рады полацкіх актывістаў высокі кастынг.

У летапісе студатрада, якім некалькі гадоў кіраваў Вадзім, нямала запамінальных і ганаровых старонак. Так, з 2014 года маладыя людзі пачалі працаваць на будаўніцтве Беларускай атамнай электрастанцыі. «Гэта значны і адказны аб'ект. Каб патрапіць у Астравец, мы праходзілі сур'ёзны адбор», — расказвае былы камандзір. Ветэраны «Эўрыкі», якія пачыналі будаўніцтва, яшчэ памятаюць, як выкладалі тратуарную плітку, а іх паслядоўнікі ўжо шчыравалі на аб'ектах жыллёвага фонду, маладзёжнага цэнтра, добраўпарадкаванні тэрыторыі АЭС. «За гады нашага ўдзелу ў будаўніцтве шмат чаго змянілася. Астравец стаў горадам будучыні — новым, камфортным, сучасным. Прыемна ўсведамляць, што мы, полацкія студэнты, таксама ўнеслі ўклад у гонар нашай краіны», — дзеліцца эмоцыямі Вадзім.

А ў 2022 і 2023 гадах байцы прымалі ўдзел у будаўніцтве аб'ектаў касмадрома «Усходні», што знаходзіцца ў горадзе Цыялкоўскі Амурскай вобласці Расійскай Федэрацыі. У жніўні 2022-га студэнты будавалі кватэры для работнікаў касмадрома, метэастанцыі, а летась удзельнічалі ў добраўпарадкаванні стартавага корпуса «Ангара», з якога і будуць запускаць ракеты.

Летась Вадзім узначаліў штаб студэнцкіх атрадаў на Усебеларускай маладзёжнай будоўлі. Але не толькі ў летні сезон і не толькі на рабоце на буйных аб'ектах студатрадаўцы займаюцца добрымі справамі. Зімой «Эўрыка» дапамагае пажылым людзям на Гомельшчыне, займаецца з дзецьмі. Цэлы год атрады змагаюцца ў розных спартыўных і творчых конкурсах, па выніках якіх размяркоўваюцца месцы на рэспубліканскім студатрадаўскім Алімпе. Сёлета полацкі студатрад імя Героя Савецкага Саюза В. І. Еранько сёмы раз запар стаў найлепшым у краіне, а агульнай колькасці студэнты ўжо дзявяты раз прывезлі перамогу ў альма-матар. Адзін з пераходных сцягоў ужо застаўся ў ПДУ назаўсёды, мэта цяперашніх байцоў — пакінуць ва ўніверсітэце яшчэ адзін такі сцяг.

Атрыманне высокага звання «Чалавек года Віцебшчыны» Вадзім лічыць агульнай перамогай усіх членаў «Эўрыкі». «Вельмі прыемна, што наш энтузіязм, намаганні і сілы былі адзначаны на ўзроўні вобласці. Гэта прымушае рухацца толькі наперад», — расказвае герой. Але такая ўзнагарода не першая ў скарбонцы камандзіра: у 2022 годзе нечакана для сябе Ложачнік па выніках гарадскога спаборніцтва «Праца. Слава. Пашана» быў удастоены звання «Чалавек года горада Наваполацка» ў намінацыі «Моладзь».

Напрыканцы пяцікурснік даў параду будучым студэнтам: уступайце ў студатрады сваіх навучальных устаноў. «Невядома, у якія класныя далечы могуць завесці гэтыя сцежкі. Вы нічога не згубіце, а пры вялікім жаданні — нават памножыце. Тады гады студэнцтва прынясуць не толькі веды, але і карысны вопыт», — дзеліцца ён.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота ПДУ.**

*Студатрад*

# Традыцыя — быць пераможцамі

Працавітасць, актыўная грамадзянская пазіцыя і ініцыятыўнасць. Здаецца, іншымі словамі і не апісаць студэнтаў і педагогаў, якія ўдзельнічаюць у дзейнасці экалагічнага студэнцкага атрада «Буравеснік» імя В. П. Пуганава, створанага на базе Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа. У чым яго ўнікальнасць? А ў тым, што з моманту свайго з'яўлення байцы штогод станавіліся найлепшымі на ўзроўні краіны ў сваёй намінацыі. Мы вырашылі даведацца, у чым сакрэт такога поспеху.



Камандзір экалагічнага атрада «Буравеснік» Дзмітрый ГАРБАЧЭНКА.

Са студэнтамі і педагогамі сустрэліся ў канферэнц-зале каледжа, паліцы якога ўпрыгожаны шматлікімі ўзнагародамі.

— У 2019 годзе нам прапанавалі прыняць удзел у працы студэнцкага атрада на базе Кобрынскага вопытнага лягсаса. Мы вырашылі, што ідэя цікавая, трэба спрабаваць, — дзеліцца **намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа Ірына ГУЛЮТА.**

Навучэнцы працуюць на тэрыторыі Засімаўскага базіснага лесагадавальніка на працягу двух тыдняў. Там яны займаюцца падрыхтоўкай грунту пад пасадкі ў гаршчкі, праполкай, перасадкай укаранелых чаранкоў і г. д. На ўвесь гэты час ім даюцца інтэрнат і транспарт да месца працы. А ўвечары пасля плённага працоўнага дня байцоў чакаюць забаўляльныя мерапрыемствы. Дарэчы, экалагічны атрад карыстаецца вялікім попытам сярод навучэнцаў.

— Праца цікавая і на свежым паветры. Да таго ж, у адрозненне ад будаўнічага атрада, у экалагічны могуць ісці яшчэ і дзяўчынкі, а не толькі хлопчыкі, — дадае Ірына Гулюта. — Наогул пасля працы ў экалагічным атрадзе многія навучэнцы вельмі моцна здружваюцца і далей падтрымліваюць цёплыя адносіны.

Безумоўна, для многіх студэнтаў такая праца — гэта магчымасць зарабіць свае першыя грошы. Зарплата добрая, і ўсё афіцыйна — па дамове і з запісам у працоўнай кніжцы. Таксама, паводле слоў камандзіра тэрытарыяльнага штаба студэнцкіх атрадаў Кобрынскай раённай арганізацыі ГА БРСМ Марыны Мартынюк, вельмі важна падтрымліваць студатрадаўскі рух на ўсіх узроўнях. Таму для дадатковай матывацыі найлепшых студэнтаў мясцовая арганізацыя БРСМ традыцыйна заахвочвае рознымі сертыфікатамі, ганаровымі граматамі. І пра кіраўнікоў, вядома, таксама не забываюцца, бо вялікая доля адказнасці за поспех экалагічнага атрада «Буравеснік» ляжыць на камандзіры і камісары.

Так, Дзмітрый Гарбачэнка ўжо двойчы быў на пасадзе камандзіра. Сам ён — майстар вытворчага навучання ў каледжы, таму знайсці агульную мову з больш чым дваццаццю падапечнымі для яго нескладана.

— На час працы атрада ты для студэнтаў як другі бацька. Працуеш нароўні з імі, каб быць прыкладам, — распавядае Дзмітрый Гарбачэнка.

Для самога маладога чалавека гэты кіраўнічы досвед быў вельмі карысным. Ён сур'ёзна задумаўся аб тым, каб развівацца і ў будучыні стаць кіраўніком.

Па словах намесніка дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце, работа ў якасці камандзіра і камісара можа быць добрым штуршком у плане асобаснага росту.

— Узяць хоць прыклад нашага камісара Валерыі Чарапанавай. Яна літаральна раскрылася на гэтай пасадзе. Стала больш упэўненай у сабе, пачала настаўніцтвам займацца. Думаю, яна шмат дасягне, не выключана, што і на кіраўніцкай пасадзе, — дадае Ірына Васільеўна.

Дык у чым жа сакрэт таго, што ўжо пяты год запар экалагічны атрад «Буравеснік» імя В. П. Пуганава становіцца пераможцам Рэспубліканскага конкурсу «Працоўны семестр»? У зладжанай рабоце студатрадаўцаў і педагогаў, якія дапамагаюць у прыгожым выглядзе прыпаднесці вынікі праведзенай работы.

— Калі вы паглядзіце часопіс студатрада, то ўбачыце сухія лічбы. Таму для ўдзелу ў конкурсе абавязкова патрэбен творчы падыход, — распавядае Ірына Гулюта.

Яны кампануюць усю інфармацыю і робяць з яе сапраўдны арт-аб'ект. Напрыклад, у 2023 годзе гэта была зялёная кніга. Важная ўмова заключаецца ў тым, што ўсё павінна быць зроблена з прыродных матэрыялаў, максімальна набліжаных да працы экалагічнага атрада.

— Поспех залежыць ад працы каманды. Кожны чалавек — вельмі адказны, ніхто не падводзіць, — дадае Ірына Васільеўна.

**Лізавета ГОЛАД.**
**Фота аўтара і з архіва каледжа.**



Навучэнцы працуюць на тэрыторыі Засімаўскага базіснага лесагадавальніка.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12 ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі газеты — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда», грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
E-mail: info@zviazda.by

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД № 38200000007667 ад 03.04.2004.
220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 11.766.
Нумар падпісаны ў 19.30 10.04.2024 г.